шляхецкай моладзі. Ім сумесна з С. Канарскім былі апублікаваны дастаткова вялікія працы па заканадаўчых актах Рэчы Паспалітай і ВКЛ, найбольш значная з якіх – «Дыпламатычны кодэкс Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага» (1758–1764). У гэты перыяд пад кіраўніцтвам таго ж С. Канарскага, вядомага выкладчыка і польскага грамадскага дзеяча, у Рэчы Паспалітай ажыццяўлялася рэформа сістэмы адукацыі, якая атрымала высокую адзнаку ў сучаснікаў.

У 1773 г. акадэмія перайшла пад апеку Адукацыйнай камісіі, якая вырашыла пераўтварыць Віленскую езуіцкую акадэмію ў вышэйшую навучальную ўстанову новага тыпу – Галоўную школу ВКЛ. Пасля другога і трэццяга падзелаў Рэчы Паспалітай (1793, 1795) Галоўная школа з 1796 г. стала называцца Галоўнай Віленскай школай. У 1803 г. Галоўная Віленская школа была рэарганізавана ва ўніверсітэт з 4 факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратурных і свабодных мастацтваў. У далейшым Віленскі ўніверсітэт стаў калыскай будучых арганізатараў і ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. – трэцяя частка студэнтаў прыняла ў ім удзел. Гэта і вызначыла лёс універсітэта, які ў 1832 г. быў закрыты расійскім імператарам Мікалаем I.

Віленскі ўніверсітэт аднавіў сваю дзейнасць у 1919 г. Ён меў наступныя факультэты: тэалагічны, права і грамадскіх навук, медыцынскі, гуманітарны, матэматыкі і прыродазнаўства, мастацтваў.

Такім чынам бачна, што вышэйшая юрыдычная адукацыя на землях Беларусі і Літвы бярэ свой пачатак з часоў існавання ВКЛ, на тэрыторыі якога ў Віленскай езуіцкай акадэміі быў створаны юрыдычны факультэт.

## СУДОВАЯ ФУНКЦЫЯ ВЕЧА НА ПРЫКЛАДЗЕ НАЎГАРОДСКА-ПСКОЎСКІХ ЛЕТАПІСАЎ

***Міхневіч А. А.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*Навуковы кіраўнік: д-р юрыд. навук, прафесар Т. І. Доўнар*

Адной са значных крыніц прэцэдэнтнага права ўсходніх славян з’яўляліся судовыя рашэнні вечавых сходаў. Перш за ўсё звесткі аб гэтым дайшлі да нас з Пскоўскага і Наўгародскага летапісаў. У нарматыўных прававых актах тых часоў не адлюстроўваецца функцыя вечавага сходу адносна судовай дзейнасці. Аднак пры знаёмстве з Пскоўскімі і Наўгародскімі летапісамі гэтая функцыя яскрава прасочваецца. Нягледзячы на тое, што Пскоў і Ноўгарад былі старажытнымі «вечавымі рэспублікамі» і веча з’яўлялася ў іх галоўным праватворчым, выканаўчым і судовым органам да моманту іх увахода ў склад Маскоўскага княства, шматлікія нормы прэцэдэнтнага права, створаныя вечавым судом, былі ўключаны ў мадэрнізаваным стане ў склад Падрабязнай праўды і Скарочанай праўды, а таксама іншых помнікаў усходнеславянскага права, у тым ліку значна пазней і ў Статуты Вялікага Княства Літоўскага.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Расійскі навуковец В. Ю. Гессен на прыкладе канкрэтных спраў паказаў судовую функцыю веча ў сваёй працы пад назвай «Вечевой суд в Новгороде и Пскове». Нягледзячы на тое, што навуковае даследаванне было праведзена ім ў 1921 г., яно не страціла сваю актуальнасць і зараз. Вучоны адзначае, што не заўсёды ў летапісах адкрыта гаворыцца пра тое, што веча выконвала судовую функцыю, аднак часта гэта выцякала са зместу ажыццяўляемых дзеянняў.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў, сцвярджаючых значэнне судовай функцыі веча, з'яўляецца прызнанне вінаватым наўгародскага пасадніка, які зняважыў Вялікага князя ВКЛ. Так, у 1346 г. князь Альгерд падышоў з узброенай сілай да Ноўгарада. Свае варожыя паводзіны ён растлумачыў тым, што наўгародскі пасаднік зняважыў яго, назваўшы сабакам. Па словах летапісца, каб уратаваць Ноўгарад ад войска Альгерда, у горадзе быў скліканы вечавы сход, на якім судзілі пасадніка. Вынікам судовага пасяджэння было прызначэнне вышэйшай меры пакарання пасадніку. Прысуд быў канчатковы і матываваны, што ўказвае на вечавы суд як канчатковую інстанцыю, рашэнні якой нельга было абскардзіць.

Пскоўскае веча, як і Наўгародскае, таксама неаднойчы збіралася для ажыццяўлення суда над вінаватымі ў складанні фальшывай граматы аб смердах. Гэтая грамата захоўвалася ў Троіцкім саборы і ўстанаўлівала абавязкі смердаў у адносінах да Пскова. Важнасць гэтых грамат была абумоўлена тым, што ў іх вызначаліся памеры падаткаў, якія павінны былі плаціць смерды, або пералік работ, якія яны абавязаны былі выканаць для горада. Магчыма ў Пскове фарміравалася дэмакратычнае грамадства, у якім зараджаліся правы не толькі вярхоў грамадства, але і простага народу. У 1484 г. адна з названых грамат была падменена іншай, дзе гаварылася пра правы смердаў на шкоду ўладзе Пскова і на карысць князя. Вынікам фальсіфікацыі граматы і было паўстанне смердаў. Каб спыніць беспарадкі, пскоўскі ўрад звярнуўся да князя, аднак скарга пскавічоў не мела поспеху. Тады, каб устанавіць справядлівасць, яны сабраліся на вечавы сход і судзілі пасадніка Гаўрылу, які ажыццявіў падлог граматы. Мерай пакарання для пасадніка была смерць.

Вельмі важна адзначыць, што судовае пасяджэнне веча падзялялася на некалькі этапаў: першы – дазнанне, другі – папярэдняе следства, трэці – вынясенне прысуду, чацвёрты – яго выкананне

У летапісах не заўсёды прама гаворыцца аб судзебнай дзейнасці веча. У некаторых выпадках можна бачыць толькі спасылкі на гэта. Трэба мець на ўвазе, што непасрэдна слова «веча» ўвогуле ў летапісах не выкарыстоўвалася. Аднак згадваемыя летапісцам падзеі, безумоўна, адносяцца да судовай функцыі веча. Маюць месца звесткі і пра папярэдняе дазнанне.

Такім чынам, акрамя таго, што веча было вышэйшым органам выканаўчай улады ў княстве, яно выконвала і ўсе функцыі судовай інстанцыі.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm